Centralna Komisja Egzaminacyjna

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

Układ graficzny © CKE 2010

**WPISUJE ZDAJĄCY**

**KOD** **PESEL**

*Miejsce na naklejkę z kodem*

dysleksja

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

# POZIOM ROZSZERZONY

**MAJ 2013**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 9 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
5. Możesz korzystać ze słowników językowych.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.

**Czas pracy: 180 minut**

**Liczba punktów do uzyskania: 45**

MOB-R1_1P-132

**Pisanie własnego tekstu w związku z tekstem literackim zamieszczonym w arkuszu. Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie.**

**Тэма 1: Параўнай матыў дуба ў творах *Дуб* Алеся Разанава і *Цар-дуб* Пятруся Броўкі. Звярні ўвагу на пабудову твораў.**

Алесь Разанаў

***Дуб***

З усіх дрэў дуб самы дужы,
самы векавечны, самы даўні і самы
будучы – ён увасабляе сабою трыяду
часу: даўніну, цяпершчыну і будучыню
і сваім існаваннем сцвярджае:
быў, ёсць, буду.

Аб дубе бытуюць паданні, але
сам ён не дбае аб тым, каб каму-небудзь
падабацца: уся яго турбота – каб і ўлетку,
і ўзімку быць сабою самім – дубам.

Усё, што робіцца з дубам, усё, што
з яго будуецца, мае адменны характар: яно
трывалае, яно добрае – яго не паточыць
шашаль[1] і ў ім не наробіць гнёздаў цвіль.

Дуб і падобны да ўсіх іншых дрэў,
і адрозніваецца ад іх менавіта сваёй большай
драўлянасцю, дрэвавасцю: ён дрэва ў дзве
кроці, у два разы, у “дубль”.

Дуб – тутэйшае дрэва ведаў: на ім
сядзіць вешчая птушка бусел, пад ім – сівы
дзед: вясковы буда.

А. Разанаў, *Дуб* [у:] Гэты ж, *Танец з вужакамі. Выбранае*, Мінск 1999, с. 370.

Пятрусь Броўка

***Цар-дуб***

З даўнейшых дзён
Па нашы дні
Сярод палескіх гоняў
Стаіць цар-дуб і ў вышыні
З аблокамі гамоніць.

Відзён той дуб
Са ўсіх дарог
З галінамі густымі...
Прыйдзеш да дуба ўчатырох, –
Ледзь стан яго абдымеш.

[1] Шашаль – насякомае атрада жукоў, лічынкі якога псуюць скуру, футра, точаць дрэва і пад.

Ды хто згадае,
Колькі год
Ён тут стаіць нязменна?
Семсот,
Ну, можа, хай – шэсцьсот,
Але ніяк не меней.

Ён, як мудрэц,
Наўкол глядзіць
З мінуўшчыны на волю...
А колькі пала чужаніц
Прад ім на чорным доле!

Плячыст цар-дуб!
Яго сукі,
Што ў неба рыштаванні...
Ад бацькі к сыну праз вякі
Аб ім ідуць паданні.

Нямала
Бачыў ён пакут,
Як рос на панскім полі;
Спяваў пад ім прыгонны люд
Аб нешчаслівай долі.

Пад ім
Паўстанцаў мучыў кат,
Іх тут жа пахавалі...
І жалуды, як слёзны град,
З яго галля спадалі.

Прайшлі гады.
І хмараў дым сышоў.
Заззялі зоры.
Стаіць цар-дуб [...]
1949

П. Броўка, *Цар-дуб* [у:] *Слова аб роднай прыродзе. Пісьменнікі і паэты Беларусі аб прыродзе*, скл. С. М. Грабчыкаў, Мінск 1989, с. 203-204.

**Тэма 2: Чалавечыя пачуцці і ўзаемаадносіны паміж людзьмі. Паразважай над праблемай на аснове аналізу і інтэрпрэтацыі твора Уладзіміра Арлова *Час чумы.* Звярні ўвагу на жанравую адметнасць твора.**

Уладзімір Арлоў

***Час чумы***
*(фрагмент)*

За два дні да ад'езду Франчэска адмовілася ад вячэры. Ён прыкладаў ёй да лобу далонь і здрыгануўся: хвароба падпільнавала і яе. [...]

Хвароба перамагала яе з незвычайнай хуткасцю. Наступнага дня Франчэска ўжо не падымалася. Поячы яе мятаю, ён змеціў на дзяснах[2] вузельчыкі, якія ператвараліся ў язвы[3]. Апошнія надзеі зніклі: гэта была чума.

Ён адыходзіў ад ложка толькі дзеля таго, каб пагрэць мятавы настой і падкласці ў кадзільніцу зёлак. Хвароба падаравала яму балючую і грахоўную радасць доўгіх гутарак з Франчэскаю.

Яна зноў і зноў прасіла яго расказаць пра радзіму. У ціхіх просьбах не было нават водценю колішняй уладнасці, і гэта рабіла ягоны боль яшчэ вастрэйшым.

Ён апавядаў пра доўгую марозную зіму і дуйкі, што заносяць бацькаў дом вышэй вокнаў, пра тое, як аднае раніцы ён адкапаў ад дзвярэй снег і, выбраўшыся на падворак, убачыў на замеценай да самага вільчака страсе трох ваўкоў. Яна слухала, як разліваецца ўвесну Нёман і як буслы збіраюцца перад выраем у чароды і, кругамі набіраючы вышыню, падымаюцца так высока, што знікаюць з вачэй.

– Мы паедзем туды, і ты ўсё гэта ўбачыш, – казаў ён, папраўляючы падушку.

– І я ўсё гэта ўбачу, – гаварыла Франчэска, і вочы яе глядзелі ўдалеч, нібы яна ўжо бачыла далёкую зямлю, дзе ён нарадзіўся.[...]

Ён сам трапляў у палон свайго ўяўлення, і яны з Франчэскаю пазіралі на вясёлы агонь у грубцы[4] і моўчкі слухалі, як шалеюць у коміне дэманы завірухі, або ішлі па цаліку на іртах[5]-снегаступах. Франчэска была ў лёгкім белым паўкажушку з ірхою[6]; яна ціха і шчасна смяялася. [...]

І раптам сэрца абрывалася, і ён вяртаўся назад і замаўкаў. Але яна, відаць, баючыся цішыні, пыталася пра Кракаў, пра каралеўскі палац, і іхняя гульня ў будучыню працягвалася.

– Ты адрэкамендуеш мяне каралеве, – казала яна, і ён, нібыта каронны маршалак, дакляраваў, што зробіць гэта ў той самы дзень, калі яны прыедуць у сталіцу.

Часам Франчэска пачынала трызніць[7]. Найчасцей яна клікала пакаёўку і загадвала ёй прынесці цаколі і бэзавую сукенку. Гусоўскі згадваў іхнюю першую размову, калі Франчэска была ў такой самай сукенцы, і яму хацелася верыць, што гэта не проста трызненне. Можа, раней ён быў несправядлівы да яе?

На чацвёрты дзень ёй зрабілася зусім блага. Франчэска ўжо маўчала, напэўна, ёй было цяжка гаварыць. Але яна глядзела на яго і не адпускала ягонай рукі, і Гусоўскі ўзіраўся ў яе вочы, намагаючыся прачытаць там усё тое, што не маглі вымавіць яе асмяглыя вусны. Ён пакутаваў, што не можа зразумець застылага ў агатавых вачах здзіўлення. Мо перад ёю паўставалі ўжо нейкія іншыя, невідочныя сферы? Ці гэтае

[2] Дзясна – слізістая абалонка поласці рота, якая пакрывае зубныя адросткі сківіц.
[3] Язва – гнойная або запалёная ранка на скуры або слізістай абалонцы.
[4] Грубка – невялікая пакаёвая печ, звычайна для абагрэву.
[5] Ірты – снегаступы.
[6] Ірха – вузенькая палоска скуры або аўчыны, якая закладваецца ў шво кажуха, рукавіцы і інш.
[7] Трызніць – гаварыць без памяці, будучы цяжка хворым або ў сне.

здзіўленне было яшчэ зямное і датычыла яго, Гусоўскага, нібыта яна толькі зараз упершыню ўбачыла яго?

Але вось яе вочы заплюшчыліся, і Франчэску агарнуў сон. Смерць забрала Эразма, а цяпер прыйшла па яе, каб ператварыць гэтую прыгажосць, гэтае зведанае, бясконца дарагое цела з сузор'ямі радзімак у спажыву чарвям[8].

Шукаючы нейкага апірышча, ён абвёў вачыма пакой. Позірк спыніўся на ацалелых босхавых гравюрах. Яго скаланула. Малюнкі ажывалі, на іх пачынаўся таемны вусцішны рух. На сярэдняй гравюры шалёным намётам неслася па крузе фантастычная кавалькада, а праваруч разгаралася зарыва пажараў і ішлі ў наступ пачвары. Свет, у якім ён жыў, як ніколі раней, здаўся яму падобным да створанага мастаком крывавага хаосу. Ён схапіў свечку і падбег да гравюраў зусім блізка.

Рух на карцінах замёр, але пакутлівае пачуццё хаосу не міналася. У Гусоўскага з'явілася адчуванне, што ён трапіў у вялізныя цяжкія жорны, якія з кожным новым імгненнем усё глыбей зацягваюць яго ў сваё каменнае чрэва.

Ратуючыся, ён запаліў усе свечкі і вярнуўся да Франчэскі. Яе дыханне зрабілася рэдкім, адначасна з выдыхам з грудзей вырываўся хрыплаваты прысвіст. Ён маліўся, каб хоць у астатнюю хвілю Бог дазволіў ім паглядзець адно аднаму ў вочы. Смерць стаяла ўжо каля самага ложка. Яму здалося, што ён змеціў яе бледны прывід. Вось смерць нахілілася над Франчэскаю для апошняга пацалунка, і яна пачала задыхацца. Ён скінуў з Франчэскі коўдры і ўбачыў, як яе грудзі падняліся і ўжо не апусціліся. Яна разлучылася з душой, так і не расплюшчыўшы вачэй.

Свет вакол яго рушыўся. У гэтым свеце панавалі пачвары.

"Дзверы адчыненыя, можаш пайсці", – загарэліся ў свядомасці словы Сенекі.

Розум дзейнічаў успышкамі, у святле якіх уваччу ўзнікалі аблічча людзей, малюнкі рымскіх вуліц і храмаў.

І раптам ён убачыў зусім іншае. Бацькаў дом пад саламянай страхою, чарада дубоў, Нёман. [...]

Божая маці, прачыстая Дзева Марыя,
Чуеш імя сваё ў песні і бачыш, напэўна,
Як затрымцела ад страху рука вершатворцы?
Раб твой пакорлівы слёзную гэту малітву
Шле да цябе, баючыся: а можа, не прымеш?
О, заступіся за нас! Праз любоў к чалавеку
Бацька наш Бог і абраў цябе сам, і паставіў
Першай заступніцай люду, і ты заступіся!..

Ён чытаў і не бачыў, што на парозе схлупілася купка ўзброеных людзей. Зыркае святло ў акне прывабіла начны дазор. Вартавыя прынюхваліся да палыновага дыму і ніякавата азіраліся. Хтосьці моўчкі паказваў на ложак з незварушнаю жанчынаю, не могучы зразумець: спіць тая ці ўжо заснула давеку? А ў пакоі ўсё мацней гучаў голас чалавека, што сядзеў пры стале з кнігамі.

– Ён моліцца, – прыслухаўшыся, сказаў нехта. Варта ўбачыла, як чалавек кінуў на стол нейкія паперы і чытаў далей па памяці.

– Яго апанаваў д'ябал, – са страхам прамовіў начальнік дазору, і ягоныя людзі, паспешліва жагнаючыся, зніклі ў мораку галерэі.

У насычаным смерцю паветры, над Франчэскаю, над цёмнымі вуліцамі Вечнага горада, дзе ўладарыла чума, гучаў Голас.

У. Арлоў, *Час чумы* [у:] Гэты ж, *Пяць мужчын у леснічоўцы. Аповесці. Апавяданні. Эсэ*, Мінск 1994, с. 118–121.

[8] Чарвяк – беспазваночны жывёльны арганізм з доўгім мяккім целам, без канечнасцей і ярка выражанай галавы.

# WYPRACOWANIE

**na temat nr....................**

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

# BRUDNOPIS *(nie podlega ocenie)*